МІЖНАРОДНЫ
КАМІТЭТ
ПА РАССЛЕДАВАННІ
КАТАВАННЯЎ
У БЕЛАРУСІ

# Катаванні людзей ЛГБТК+ і гамафобная палітыка рэжыму

Справаздача Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі ў суаўтарстве з Прававой ініцыятывай

На аснове дадзеных, сабраных Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі і ПЦ «Вясна»



VIASNA
ПРАВАВАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

# Уступ

Правы людзей ЛГБТК+ сістэматычна парушаюцца Рэспублікай Беларусь. Парушэнні закранаюць многія катэгорыі правоў чалавека, уключна з правам не трапляць пад катаванні, правам на справядлівае судовае разбіранне, правам не быць дыскрымінаваным (роўнасць) і інш. Негатыўныя публічныя выказванні на самым высокім узроўні, а таксама актыўнае лабіяванне прадстаўнікамі беларускіх рэлігійных інстытутаў (царквы, касцёла) ці пра-рэлігійных арганізацый «традыцыйных каштоўнасцяў» прамым чынам садзейнічаюць прияве дыскрымінацыі і ствараюць спрыяльную глебу для злачынстваў супраць ЛГБТК+ на падставе нянавісці. Падзеі 2020 года паказалі ўзровень гамафобіі беларускай дзяржавы.

# Змест

Уступ ........ 2

Дыскрымінацыя людзей ЛГБТК+ – кароткія высновы ........ 4

Гамафобія на дзяржаўным узроўні ........ 6

«Выбачэнні» за сексуальную арыентацыю і (ці) гендарную ідэнтычнасць ........ 8

Дзяржаўны выклік у дачыненні да людзей ЛГБТК+ пасля падзеяў 2020 года ........ 10

Катаванні ў месцах затрымання, утрымання і адбыцця пакарання ў дачыненні да людзей ЛГБТК+ і людзей, якія на думку сілавікоў, належаць да ЛГБТК+ ........ 12

- Абраза людзей праз прыніжэнне ЛГБТК+ ........ 12
- Колер, даўжыня валасоў як падстава для гвалту і прымянення катаванняў: ........ 13
- Адзенне і змесціва рэчаў як падстава да яшчэ большага прымянення катаванняў ........ 14
- Вымушаны камін-аўт[1], аўтынг[2] ........ 16
- Пагрозы сексуалізаванага згвалтавання ........ 17
- Прымяненне фізічнага гвалту за тое, што чалавек з'яўляецца ЛГБТК+ ........ 18
- Паказанні сведкаў пра фізічны гвалт за прыналежнасць да ЛГБТК+, у тым ліку па здагадках і меркаваннях на падставе знешнасці: ........ 19
- Сексуалізаваны гвалт ........ 20

Высновы ........ 21

---

1 Вымушаны камін-аўт – наданне галоснасці інфармацыі пра сексуальную арыентацыю ці гендарную ідэнтычнасць чалавека без добраахвотнай згоды, свабодных і бяспечных абставінаў.

2 Аўтынг – публічнае разгалошванне інфармацыі пра прыналежнасць чалавека да ЛГБТК+ супольнасці без добраахвотнай згоды.

# ДЫСКРЫМІНАЦЫЯ ЛЮДЗЕЙ ЛГБТК+ – КАРОТКІЯ ВЫСНОВЫ

Па стане на красавік 2023 года, грунтуючыся на дадзеных Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі і Праваабарончага Цэнтра «Вясна», у месцах затрымання, месцах утрымання і месцах адбыцця пакарання прымяняўся псіхалагічны гвалт у выглядзе абразаў, прыніжэнняў і пагрозаў да асобаў, якія знешне выглядалі «ненарматыўна»[1]. Часта сілавікі выкарыстоўвалі прыніжэнне праз гамафобныя выказванні: «підары», «петушня», «педзікі» і інш. Такія словы выкарыстоўваліся да затрыманых, якія наўпрост не называлі сябе прадстаўні_цамі ЛГБТК+. Падобныя дзеянні маюць за мэту не толькі прынізіць, але і трымаць у страху больш моцнага прымянення фізічнага і сексуалізаванага гвалту. Людзі, якія выглядалі «ненарматыўна», былі пад большай рызыкай прымянення катаванняў.

Незаўважнасць у грамадстве і адсутнасць сур'ёзнага абмеркавання сітуацыі з правамі ЛГБТК+ з'яўляюцца тэмай, якая паўтараецца ў гэтым матэрыяле. Многія людзі ЛГБТК+ хаваюць сваю сексуальную арыентацыю ці гендарную ідэнтычнасць у паўсядзённым жыцці з-за страху негатыўных рэакцыяў у школе, на працы, у месцы пражывання ці ў сям'і. Яны асцерагаюцца, што абазнанасць іншых пра іх сексуальную арыентацыю і гендарную ідэнтычнасць прывядзе да дыскрымінацыі, пераследу, непры-

1 Ненарматыўны знешні выгляд у дадзеным матэрыяле азначае любое адступленне ад нормаў «мужчына» і «жанчына» і ўяўленняў, як павінны выглядаць «мужчыны» і «жанчыны». Напрыклад, «мужчыны» – кароткія валасы, адсутнасць макіяжу, пэўная вопратка.

няцця ці нават гвалту[2]. У месцах затрымання, утрымання і адбыцця пакарання схаваць сваю ідэнтычнасць значна складаней, паколькі ў сілавых структураў ёсць доступ да ўсіх асабістых рэчаў (ад торбы да тэлефона), а агучванне сваёй прыналежнасці да ЛГБТК+ можа прывесці да ўзмацнення гвалту з боку сілавых структураў.

2 Дыскрымінацыя па прыкмеце сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці ў Еўропе (выданне – Рада Еўропы): https://rm.coe.int/-/16807b8ae5 (доступ: 26/04/2023)

# ГАМАФОБІЯ НА ДЗЯРЖАЎНЫМ УЗРОЎНІ

Гамафобія ці гамафобныя паводзіны[1] ў Беларусі распаўсюджаныя дастаткова даўно і на самым высокім узроўні. Пачынаючы з 2010 года ў СМІ прасочваюцца публічныя гамафобныя выказванні Аляксандра Лукашэнкі[2] [3].

Першы зафіксаваны СМІ напад па прычыне гамафобіі ў Беларусі быў здзейснены ў 2014 годзе. У 2015 годзе пацярпелы – Міхаіл Пішчэўскі – памёр з-за нанесеных траўмаў, якія мелі сур'ёзныя наступствы: выдаленне пятай часткі мозгу. Нападніка – Дзмітрыя Лукашэвіча – прызналі вінаватым у злосным хуліганстве і нанясенні цяжкіх пакалечанняў па неасцярожнасці. Яго асудзілі да 2,8 гадоў калоніі і абавязалі выплаціць 213 мільёнаў беларускіх рублёў кампенсацыі [каля $12 тыс.]. Аднак у пачатку кастрычніка 2015 года Лукашэвіч выйшаў на свабоду па амністыі[4]. Пасля

1 Гамафобія ці гамафобныя паводзіны – гэта ірацыянальны страх, нянавісць ці агіда да людзей ЛГБТК+ (людзей, якія не адпавядаюць традыцыйным уяўленням грамадства пра гендар ці сексуальнасць) – https://www.unfe.org/definitions/ (дата доступу: 01/05/2023).

2 У 2020 годзе адбыліся выбары на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія былі сфальсіфікаваныя дзейным рэжымам. Пасля пачаліся масавыя акцыі пратэсту супраць фальсіфікацыі выбараў, якія былі жорстка задушаныя, з прымяненнем катаванняў, гвалту і спецсродкаў. Шэраг еўрапейскіх краінаў не прызналі Лукашэнку легітымным прэзідэнтам – https://meduza.io/short/2020/09/23/kakie-strany-ne-priznali-lukashenko-legitimnym-prezidentom-belarusi-spisok (дата доступу: 01/05/2023).

3 Міністр замежных справаў Германіі Гіда Вестэрвэле, адкрыты гей, прыязджаў у Мінск на перамовы, а ў лютым 2012-га абвінаваціў Лукашэнку ў дыктатуры. На дзяржаўным спартовым мерапрыемстве ў тым жа годзе Лукашэнка заявіў пра Вестэрвэла: «Што тычыцца другога – ці тое ружовага, ці тое блакітнага – які там пра дыктатуру крычаў, дык вось я, пачуўшы гэта, падумаў: лепш быць дыктатарам, чым блакітным, вядома». – https://zaborona.com/ru/kak-belaruskie-vlasti-ispolzuyut-gomofobiyu-dlya-repressij/ (дата доступу: 01/05/2023).

4 Па словах аднаго са сведкаў на судзе, нападнік сказаў: «Підарасы сабраліся», а Пішчэўскі, які выходзіў разам з ней, спытаў у кампаніі, якая ўключала Лукашэвіча: «Хто тут підарасы?» У выніку далейшай сваркі Лукашэвіч ударыў Пішчэўскага, той упаў на асфальт. На судзе Лукашэвіч сказаў, што «адчуў пагрозу». Лекары канстатавалі ў Пішчэўскага пералом чэрапу і кровазліццё ў мозг. Міхаіл прабыў у бальніцы амаль паўтара гады – не рухаўся, рэдка прыходзіў у свядомасць, харчаваўся праз катэтар. Родныя праводзілі з ім у бальніцы да 18 гадзінаў у суткі. – https://www.currenttime.

таго, як Міхаіл памёр у бальніцы, тэрмін павялічылі на год. Варожасць на глебе гамафобіі суд так і не прызнаў[5].

У жніўні 2019 года падобнае паўтарылася. Невядомы мужчына напаў на ЛГБТК-кампанію на вуліцы Кастрычніцкай у горадзе Мінску, сталіцы Рэспублікі Беларусь. Ён збіў беларускага рэжысёра і аператара Мікалая Купрыча, у выніку чаго ў апошняга зафіксаваныя шматлікія гематомы і пералом носа. Яшчэ адзін хлопец трапіў у бальніцу. Суд прызнаў таго, хто напаў, вінаватым па артыкуле «злоснае хуліганства», асудзіўшы да 1,5 гадоў абмежавання свабоды без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу[6].

Такім чынам, што ў першым, што ў другім выпадках дзяржава заплюшчыла вочы на нянавісць, назваўшы злачынства на глебе нянавісці злосным хуліганствам.

У сакавіку 2020 года дырэктар дабрачыннага фонду «Адкрытыя сэрцы» Уладзіслаў Валаховіч [пралайф-арганізацыя, якая выступае супраць абортаў], архібіскуп Тадэвуш Кандрусевіч [каталіцкая царква], протаіерэй Андрэй Лемяшонак [праваслаўная царква] сабралі 52 тысячы 600 подпісаў пад калектыўным зваротам для Лукашэнкі з просьбай «ініцыяваць прынясце закона аб забароне прапаганды і публічнай дэманстрацыі гомасексуалізма і іншых полавых вычварэнстваў непаўнагадовым». Мэтай збору подпісаў было «захаваць традыцыйныя каштоўнасці». Пад традыцыйнымі каштоўнасцямі яны разумелі цноту да шлюбу, сужэнскую вернасць, шматдзетнасць, адкрытасць да нараджэння кожнага дзіцяці, разуменне сям'і як саюза мужчыны і жанчыны. Таксама ініцыятары звароту дабіваліся ўвядзення крымінальнай адказнасці для людзей, якія «прапагандуюць» ЛГБТК+ у Беларусі. Пад прапаганду, у разуменні аўтараў звароту, трапляюць і вясёлкавы сцяг на будынку брытанскай амбасады, і фестываль квір-культуры, і семінары па гендарнай роўнасці, і проста выпадак на адной з выстаў, «калі ў адным памяшканні быў дзіцячы тэатр і праходзіў выступ адкрытага гея»[7].

Тады гэты зварот займеў вялікі рэзананс, аднак прававых зменаў на той момант не адбылося.

---

tv/a/27329305.html (дата доступу: 01/05/2023).

5 https://kyky.org/pain/chtoby-bolshe-nikto-ne-umer-kak-misha-pischevskiy-kak-sotsseti-reagiruyut-na-izbienie-kompanii-lgbt (дата доступу: 01/05/2023).

6 «Ты таксама підар?» – з гэтай фразы пачаў размову невядомы. Купрыч кажа, што адказаў: «Ну добра, няхай я буду підарам – і што далей?» І атрымаў удар у скроню, пасля якога ўпаў. Пакуль ён быў без свядомасці, мужчына збіў яшчэ двух хлапцоў з кампаніі Мікалая. Купрыч пазней сказаў, што ён гетэрасексуальны, але ў той сітуацыі не хацеў адпрэчвацца ад сваёй кампаніі па прыкмеце «нармальнасці». – https://reform.by/19-letnij-paren-poluchil-prigovor-za-napadenie-na-lgbt-kompaniju (дата доступу: 01/05/2023).

7 «Прынясце такога закона, паправак у Крымінальны кодэкс і надведамаснай нацыянальнай праграмы па захаванні традыцыйных каштоўнасцяў з'яўляюцца неабходнымі для будучыні нашай краіны, для існавання беларусаў як самабытнай і суверэннай нацыі» – сцвярджалі аўтары звароту https://euroradio.fm/ru/52600-podpisey-za-zapret-lgbt-propagandy-zashchita-ili-razzhiganie (дата доступу: 01/05/2023).

## «ВЫБАЧЭННІ» ЗА СЕКСУАЛЬНУЮ АРЫЕНТАЦЫЮ І (ЦІ) ГЕНДАРНУЮ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ

Пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года пачаліся масавыя рэпрэсіі, у тым ліку і ў дачыненні да прадстаўні_ц ЛГБТК+. Так, беларуская дзяржава стала выкарыстоўваць людзей ЛГБТК+ для прапаганды. Напрыклад, на «відэа з каяннямі» пасля прымянення катаванняў затрыманых прымушаюць казаць пра сваю сексуальную арыентацыю. Затрыманы Віталь Рубіч кажа на камеру, што «з 2016 года ён – прыхільнік нетрадыцыйных сексуальных арыентацый» і «перыядычна, разы два-тры ў год, займаюся сексам з хлопцам». У канцы ён дадае: «Разумею, што гэта з'яўляецца амаральным, абавязваюся выправіць». Беларускія праваабаронцы лічаць, што сілавікі выкарыстоўваюць разгалошванне гомасексуальнасці затрыманых як дадатковы рэпрэсіўны інструмент, каб іншыя зняволеныя таксама ціснулі на іх[1].

У 2021 годзе быў затрыманы Арцём Баярскі. Падчас допыту Арцём паведаміў адвакату, што яго білі дубінкамі па спіне і ягадзіцах, прымушаючы прызнацца, што ён з'яўляецца адміністратарам прызнанага экстрэмісцкімі тэлеграм-канала і чата «Мая краіна Беларусь», а таксама ў тым, што ён належыць да ЛГБТК+[2].

Таксама незаконна затрыманы (за падтрымку Украіны) Ігар Каролік у 2022 годзе ў 17-секундным «пакаянным» відэа абражае сябе і на крыміналь-

1 https://zaborona.com/ru/kak-belaruskie-vlasti-ispolzuyut-gomofobiyu-dlya-repressij/ (дата доступу: 01/05/2023).
2 https://news.zerkalo.io/life/7002.html (дата доступу: 01/05/2023).

ным жаргоне «прызнаецца» ў гомасексуальнай арыентацыі. Тытрамі на відэа вялікімі чырвонымі літарамі напісана «ГУБАЗ не пацерпіць петушыную-фашысцкую мразь на сваёй зямлі…»[3]

3 https://news.zerkalo.io/cellar/29236.html (дата доступу: 01/05/2023).

# ДЗЯРЖАЎНЫ ВЫКЛІК У ДАЧЫНЕННІ ДА ЛЮДЗЕЙ ЛГБТК+ ПАСЛЯ ПАДЗЕЯЎ 2020 ГОДА

У 2021 годзе Беларусь была на 61-м месцы з 150 у рэйтынгу краінаў, небяспечных для прадстаўні_ц ЛГБТК+[1].

З прычыны таго, што ў Беларусі ў 2021 годзе практычна ўсе незалежныя некамерцыйныя арганізацыі грамадзянскай супольнасці, у тым ліку і арганізацыі, якія працуюць з тэмай ЛГБТК+, былі прымусова ліквідаваныя рэжымам, у людзей ЛГБТК+ у Беларусі не засталося ніякіх інструментаў абароны ад гамафобіі, пачынаючы ад гамафобіі на вуліцы і заканчваючы гамафобіяй з боку дзяржавы. У Беларусі няма антыдыскрымінацыйнага заканадаўства, ні ў адным беларускім законе няма ўзгадвання пра дыскрымінацыю па прыкмеце сексуальнай арыентацыі. Больш за тое, ужо вядомы факт фіксацыі ў заканадаўстве, якое рэгулюе пытанні хатняга гвалту, прынцыпу «захавання традыцыйных сямейных каштоўнасцяў»[2].

Усё вышэйпададзенае сведчыць пра тое, што Рэспубліка Беларусь парушае міжнароднае права, не выконваючы ўмовы міжнародных дамоваў, бокам якіх яна з'яўляецца, паколькі не можа гарантаваць людзям ЛГБТК+ абарону ад гвалту (гл. п. 2 і 3 ), абарону ад катаванняў і жорсткага, бесчалавечнага, прыніжальнага абыходжання з ЛГБТК+ ва ўмовах утрымання пад вартай (гл. п. 9) і – самае галоўнае, – абарону ад дыс-

1 https://euroradio.fm/ru/v-reytinge-stran-opasnyh-dlya-lgbt-belarus-zanyala-61-e-mesto https://rainbow-europe.org/country-ranking (дата доступу: 01/05/2023).

2 Закон Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў» у рэд. ад 06/01/2022 № 151-З.

крымінацыі на падставе сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці.

Апошнім часам, пачынаючы з 2022 года, беларускія праўладныя медыя сталі трансляваць пазіцыю расійскіх уладаў у дачыненні да супольнасці ЛГБТК+[3].

У 2022 годзе беларуская праўладная прапагандыстка з Гродна Вольга Бондарава напісала скаргу з-за білборда з рэкламай навушнікаў у цэнтры Мінска, назваўшы паказаную на плакаце мадэль «трансгендарнай жанчынай», і ўбачыла ў яе знешнасці «прапаганду ЛГБТК+». Праз суткі пасля скаргі ў «кампетэнтныя органы» білборд знік: яго змяніла сацыяльная рэклама[4].

29 снежня 2022 года старшыня Рады Рэспублікі Наталля Качанава заявіла пра магчымае з’яўленне закона пра забарону прапаганды ЛГБТК+ у Беларусі[5]. У 2023 падобную думку пацвердзіў Лукашэнка[6].

Такім чынам, дзяржаўная палітыка скіраваная на фармаванне і падмацаванне гамафобных поглядаў, думак, меркаванняў, а гамафобія і злачынствы на глебе нянавісці [гамафобія – нянавісць] некаральныя.

Ва ўмовах, калі ў краіне ліквідавана больш за 800 няўрадавых арганізацый, якія дапамагаюць[7], ва ўмовах прававога дэфолту, адсутнасці пакарання за злачынствы, на жаль, магчымае прыняцце любых законаў, якія будуць парушаць правы чалавека.

Калі мы кажам пра катаванні ў дачыненні да незаконна затрыманых людзей, то нянавісць з прычыны сексуальнай арыентацыі і (ці) гендарнай ідэнтычнасці рэжымам выкарыстоўваецца як інструмент ціску і пагрозаў прымянення катаванняў на ўсіх стадыях незаконнага затрымання і ўтрымання людзей.

---

3 https://t.me/sbbytoday/72521 – СБ «Беларусь сегодня», https://mlyn.by/04022023/lgbt-kak-verhushka-ajsberga-antitrendy-kotorye-navyazyvayutsya-obshhestvu, https://t.me/mlynby/81035 – «Минская правда», https://t.me/belta_telegramm/157298, https://t.me/belta_telegramm/162298 – Белта; (дата доступу 27/04/2023).

4 https://news.zerkalo.io/life/23709.html (дата доступу: 01/05/2023).

5 https://news.zerkalo.io/life/29379.html: «Меркаванне такое ёсць, і, можа быць, нам трэба будзе выступіць з заканадаўчай ініцыятывай пра недапушчэнне распаўсюду ЛГБТ. Калі я была з афіцыйным візітам у Маскве, якраз у той дзень у Дзяржаўнай думе прынялі закон пра забарону прапаганды ЛГБТ. Напэўна, давядзецца прымаць і нам. І гэта будзе правільна. Нельга гэта прапагандаваць. У нас ёсць сямейныя каштоўнасці, традыцыі, якія мы перадаем з пакалення ў пакаленне: традыцыі сям’і, праваслаўя» (дата доступу: 01/05/2023).

6 https://news.zerkalo.io/life/35880.html (дата доступу: 01/05/2023).

7 https://reform.by/321551-857-organizacij-likvidirovany-ili-nahodjatsja-v-processe-likvidacii-v-belarusi (дата доступу: 01/05/2023).

## КАТАВАННІ Ў МЕСЦАХ ЗАТРЫМАННЯ, УТРЫМАННЯ І АДБЫЦЦЯ ПАКАРАННЯ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ЛЮДЗЕЙ ЛГБТК+ І ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ НА ДУМКУ СІЛАВІКОЎ, НАЛЕЖАЦЬ ДА ЛГБТК+

### Абраза людзей праз прыніжэнне ЛГБТК+

Па словах незаконна затрыманых асобаў, камунікацыя з боку сілавікоў была агрэсіўнай і абразлівай.

> *«Ненарматыўная лексіка была кожнае другое слова, кожную другую фразу. Т. б. гэта было пастаянна».*

У дачыненні да многіх асобаў выкарыстоўваліся абразы «петушня», «петушары», «підары», «педзікі» – тыя словы, якія абражаюць людзей ЛГБТК+, у дадзеным кантэксце прыроўніваючы затрыманых да ўразлівай групы, прыніжаючы прадстаўні_ц ЛГБТК+ яшчэ больш. У выніку чаго людзі ЛГБТК+, якіх затрымалі, знаходзіліся ў яшчэ большым страху і небяспецы.

- *«Я ў Telegram быў падпісаны на чат аднаго мясцовага гей-актывіста. І яны знайшлі гэты чат і такія: “О! Дык яны підарасы! Яны ў жопу ябуцца!” І ўсе такія: “Ха-ха-ха!” Карацей, перыядычна яшчэ гэтыя каментары былі пра тое, што мы, там, “підары”, “у жопу ябемся”…»*

- *«Адзін сяржант там быў з дубінкай. Я рэчы правяраў, а ён: “Певень апушчаны, што ты там вытвараеш”».*

- *«Адзін супрацоўнік АМАП стаў казаць: "Блін, гэтыя підары і лесбіянкі будуць хадзіць па горадзе. Вось чаго вы дабіваецеся". Я сказала: "Мы і так ужо даўно ходзім па горадзе. Вы крыху спазніліся"».*

Абразы і прыніжэнні, выкарыстанне «жартаў» пра ЛГБТК+ з'яўляецца мовай нянавісці, якая прыводзіць да гвалту і падтрымлівае яго.

## Колер, даўжыня валасоў як падстава для гвалту і прымянення катаванняў:

Таксама абразы [у выглядзе «жартаў»] прымяняліся ў дачыненні да людзей з яркімі каляровымі валасамі (чырвоны, фіялетавы, сіні і інш. колеры) ці з пэўнай даўжынёй валасоў:

- *«Потым ён пачаў жартаваць жарты пра мае валасы, у мяне былі вось тут вось ружовыя валасы зверху, я зараз іх перафарбавала, і салатавыя знізу. Пачаў жартаваць, што мае валасы як вясёлкавы сцяг, у гэты момант я напружылася, таму што гэты начальнік не выклікаў асаблівага даверу. Ён сказаў: "Ну я, вядома, не супраць". Але штосьці мне падказвае, што калі б ён быў супраць, то мы б гаварылі інакш…»*

- *«Мне асабіста прыляцела, яны вельмі смяяліся з маёй прычоскі, там такія абразы, тыпу: "А, певень, што гэта?, і г. д."»*

- *«… у мяне ў той момант, можна сказаць, быў іракез на галаве, таксама пастаянна на гэта рабілі акцэнт, што я певень, петушарня».*

Пагражалі і (ці) адразалі валасы людзям з мужчынскай сацыялізацыяй. Былі выпадкі, калі валасы зразалі са скурай.

- *«…адзін з супрацоўнікаў пачаў казаць, што ў мяне доўгія валасы, і ён сказаў іншаму супрацоўніку, каб ён прынёс нажніцы. Яны штосьці непрыемнае казалі. Але на самай справе ніхто нажніцы не прынёс, проста так здзекаваліся… Наколькі я ведаю, такое здаралася, што маглі камусьці адрэзаць валасы для здзеку. У любым выпадку, гэта здзек. Але яны спыніліся чыста на словах. Я не ведаю, наколькі яны маглі гэта зрабіць, цяжка ацаніць…»*

- *«Гразіліся: “Глядзі, валасы, дык давай іх зрэжам, цягні нож”».*

Акрамя абразаў і прыніжэнняў, выкарыстоўваліся пагрозы, якія тычыліся адначасова затрыманых і ўсёй сацыяльнай групы – ЛГБТК+:

- *«Раптам уварваўся ў пакой той, з якія мы сустракаліся ўжо, начальнік па ахове правапарадку, штосьці там крыкнуў: “Ды ты што, підарас, тыпу, аказваецца” і дадаў, што такіх, як я, трэба забіваць, агулам такое нешта, не памятаю дакладных фармулёвак, але неяк так было ўсё. І хутка сышоў».*

- *«“Незразумела, куды садзіць [дачыненне да трансперсоны], давайце выведзем у двор і расстраляем”. Некалькі разоў гэта было паўторана, што такіх сук, як я, яны трымаць у сябе не будуць: “У двор – і расстраляць”, “У двор – і расстраляць”, па некалькі разоў».*

Гвалт з-за знешнасці – наступствы патрыярхальнага парадку грамадства і дзяржавы, адсутнасці падтрымкі і прасоўвання альтэрнатыўных варыянтаў развіцця і, безумоўна, дыктатарскага рэжыму дзяржаўнага ладу. Такім чынам, патрыярхальны парадак дзяржавы асабліва ярка бачны ў сітуацыях катаванняў і гвалту. «Не такая» знешнасць становіцца падставай для прымянення гвалту, а таксама вызваляе ад адказнасці (як ва ўмовах «спакойнага» часу, так і ва ўмовах прававога дэфолту). Часцей за ўсё гвалт, які здзяйсняюць з-за «не такой» знешнасці, мае пад сабой нянавісць да ЛГБТК+, паколькі, напрыклад, дзяўчыну з кароткімі валасамі сілавікі ўспрымаюць адразу як лесбіянку, а мужчыну з доўгімі – як гея, пры гэтым людзі могуць быць з рознай ідэнтычнасцю. Транслюдзей, небінарных людзей дзяржава ўспрымае як нешта невядомае, смешнае, што таксама выклікае рэакцыю ўзмацнення псіхалагічнага і фізічнага гвалту.

## Адзенне і змесціва рэчаў як падстава да яшчэ большага прымянення катаванняў

Колеры адзення чалавека, якія, на думку сілавікоў, не супадалі з іх стэрэатыпным падзелам на «мужчынскае» і «жаночае», па словах пацярпелых, выклікалі агрэсію, абразы:

- *«Пры вобшуку знайшлі чырвоныя шкарпэткі. Гэты супрацоўнік казаў, што я підарас, таму што ў мяне чырвоныя*

*шкарпэткі, што мяне трэба апусціць[1], што мяне зараз адправяць у камеру з апушчанымі, там мяне таксама апусцяць з-за гэтых чырвоных шкарпэтак».*

- *«У мяне ў пакоі вісела ЛГБТ-торба. Таксама ў той адрас. Змазка яшчэ была. Для іх гэта таксама тыпу: "А, у жопу ябуцца..."».*

Пры затрыманні людзей на адным з мерапрыемстваў, на якім прысутнічалі розныя людзі, аднаму хлопцу з яркім макіяжам прынеслі жаночыя чаравікі:

- *«Там быў хлопец, яму, калі ён прасіў абутак – ён быў такі, там яшчэ былі людзі такія з ЛГБТ-кам'юніці, – і з-за таго, што ў яго быў такі яркі мэйк, яны сказалі, што яму прынясуць толькі жаночыя чаравікі. Прынеслі толькі жаночыя чаравікі і не далі яму абутак».*

Гэта кажа пра тое, што паколькі ў грамадстве прынята, што макіяж – «жаночае», калі раптам маскулінная персона фарбуе валасы, твар, пазногці – гэта адразу прыроўнівае яго да ЛГБТК+-супольнасці, што з'яўляецца прыніжэннем у месцах затрымання, утрымання, адбыцця пакарання. Людзі ЛГБТК+ у месцах утрымання, адбыцця пакарання з'яўляюцца больш уразлівымі, чым цысгендарныя гетэралюдзі ці людзі, якія выглядаюць «нарматыўна».

- *«У аднаго сукамерніка забралі дзённік, які ён вёў... ён перажываў, што, калі яго забіралі, быў нафарбаваны пазногаць ці ён неяк паспрачаўся, што яму сяброўка нафарбуе пазногці, і ён перажываў, што калі б яго забралі яшчэ з нафарбаванымі пазногцямі, былі б нейкія праблемы. І ахоўнікі, якія забралі яго дзённік, яны яго прачыталі. І на наступнай праверцы пыталіся, чый гэта дзённік, пыталіся, ці не гей ён, таму што там пра нафарбаваныя пазногці... Усё гэта з матамі, натуральна».*

Змесціва рэчаў таксама з'яўлялася падставай лічыць, што людзі з'яўляюцца ЛГБТК+. Напрыклад, калі людзі выглядалі маскулінна, але мелі з сабой «жаночыя» рэчы, прыналежнасці, іх «падазравалі ў гомасексуальнасці», што павышае рызыку прымянення гвалту ў месцах затрымання і ўтрымання:

---

1 Паняцце крымінальнага жаргону, што азначае чалавека, які займае самую нізкую ступень у турэмнай іерархіі.

- *«...пры вопісе, калі шарыліся па заплечніку, у мяне такая маленькая касая кішэнька спераду. Я такі: "Вы асцярожна, там ніткі ляжаць". Жанчына, якая робіць вопіс, такая: "Вы што, гей?"»*

- *[адносіны да трансперсоны] «Аглядалі ўсе рэчы, якія там былі, знайшлі гігіенічныя пракладкі, на што спыталі: "А навошта яны табе?" Спачатку са здзіўленнем, потым са смехам».*

## Вымушаны камін-аўт, аўтынг

Адносіны сілавікоў да незаконна затрыманых людзей пагаршаліся асабліва, калі людзі вымушана рабілі камін-аўт (напрыклад, транслюдзі), ці пры знаходжанні падчас агляду тэхнікі асабістых перапісак, фотаздымкаў – якія казалі пра сексуальную арыентацыю ці гендарную прыналежнасць людзей, а таксама ВІЧ-статус. Так, вопыт затрымання трансперсоны на працягу ўсіх працэдураў (ад моманту затрымання да вызвалення), паказвае яўную трансфобію:

- *«Хлопцу, у якога ВІЧ, яны ведалі яго статус. Яны казалі, што яго трэба спаліць разам з гэтым домам, пагражалі.... Напрыклад, у аднаго хлопца раскрылі яго статус ВІЧ... ён там яшчэ быў са сваім хлопцам. На іх увогуле заводзілі справу, што ён нібыта яго сілай заражае. Гэта ж крымінальны артыкул. Іх вазілі як на следчы эксперымент».*

- *«Ён там пачаў "Дык ты з гэтых? Прапагандуеце тут садамію, вычварэнствы", вось. Пачаў пытанні задаваць. Як, тыпу, што ты, актыў ці пасіў? Пабег па паверхах, усім распавядаць, што мы тут гея затрымалі, вось. Тыпу пачаў штосьці мне казаць: "Такіх, як ты, яшчэ дзяржава бясплатна вучыць". Ну, было страшна, вядома, вельмі. Адчуваў сябе дрэнна, скажам так, нейкі такі быў стан у мяне, ванітаваць нават хацелася, вось. Працягвалася каля гадзіны, нават больш».*

Трансфобія ў месцах утрымання. Пасля таго, як сілавікі даведваюцца гендарную ідэнтычнасць затрыманых, да іх пачынаецца так званае «асаблівае стаўленне», якое выяўляецца ў выглядзе прыніжальных пытанняў, абразаў, пагрозаў. Часам можа даходзіць да фізічнага гвалту.

- *«"У сэнсе, як гэта ПІБ у мужчынскім родзе? Дык ты што, хлопец?", "Ды ладна, ды я не веру, у сэнсе, гэта хлопец?" Яны*

*прыглядаюцца, удакладняюць: "У сэнсе? Ты дакладна хлопец?", "А што, аперацыю ўжо зрабіў ці не зрабіў?", "Ты не пераблытай, гэта хлопец, гэтага трэба ў мужчынскую", з каментарамі: «Я сам у шоку, ды якая гэта лухта, паглядзі, каго мы затрымліваем, паглядзі на вось гэта вось, вось гэта вось хлопец", "Давай пасадзім яго да хлопцаў, паглядзім, што атрымаецца, як будзе", "Садзіце да мужыкоў, яны яго/яе навучаць, як сябе правільна паводзіць, яны там разбяруцца, вось будзе весела, вось захацеў быць хлопцам – зараз мы яму пакажам хлопцаў", "Зараз мы цябе закінем у камеру да сапраўдных зэкаў. Паглядзім, як цябе выя..ць, і хто ты там – хлопец ці дзяўчына"».*

- *«"Я трансхлопец, у мяне ёсць грудзі". Мне сказалі з матам: "Ідзі на хуй, ты назваўся хлопцам, не выёбвайся, раз такі хлопец, значыць, распранайся да трусоў, нам похуй..." яны працягвалі гэта ўсё абмяркоўваць, перадаваць іншым, хто не паспеў убачыць, што ў мяне там увогуле, у мяне там грудзі».*

## Пагрозы сексуалізаванага згвалтавання

Варта адзначыць, што часта, калі сілавікі лічылі, што чалавек з'яўляецца ЛГБТК+, у дачыненні да яго адразу выкарыстоўваліся пагрозы сексуалізаванага гвалту. Напрыклад, яркі колер валасоў у чалавека для супрацоўнікаў сілавых структураў азначае, што чалавек належыць да ЛГБТК+:

- *«Ты петушара, мы цябе зараз у жопу выябем».*

- *«[пасля таго, як заўважылі, што доўгія валасы сіняга колеру] "ну ўсё, зараз дубінкі ў жопу табе будзем засоўваць, зараз цябе згвалцяць", і клічуць другога амапаўца. Пара стаіць нада мной, абражаюць, кажуць, што згвалцяць і такія, умоўна імя скажу, "трэба Толіка паклікаць, ён у нас галоўны практолаг"».*

- *«Я сядзеў на крэсле, ён [сілавік] стаў побач са мной, паклаў мне руку на шыю, пачаў мяне гладзіць па шыі і твары, і кажа што "ты такі хлопчык прыгожы, у нас тут такіх любяць". "Зараз, – кажа, – я цябе адвяду ў іншы пакой. Мы цябе там упяцёх выябем, потым я патэлефаную тваёй жонцы, каб яна прыехала цябе забрала, мы яе выябем пры табе, і паглядзім, што ты пасля гэтага будзеш нам распавядаць, казаць, адмаўляць, у прынцыпе, паглядзім, як ты сябе будзеш паводзіць у*

*гэтых абставінах"».*

Звязвалі ЛГБТК+ з наркотыкамі – дадзенае параўнанне грунтуецца на прымітыўным поглядзе: калі людзі належаць да адной «маргінальнай групы», значыць, яны належаць і да іншых «маргінальных групаў». Напрыклад, калі ў мужчыны ВІЧ, значыць, ён гей, калі ён гей – значыць, ён ужывае наркотыкі.

- *«У бусіку лічылі, што я адразу певень, підар, там чамусьці ён пачаў пытацца ў мяне пра наркотыкі: "Як вы ставіцеся да гэтага, ужываеце, не?"»*

## Прымяненне фізічнага гвалту за тое, што чалавек з'яўляецца ЛГБТК+

Пасля таго, як сілавікі даведваліся пра тое, што незаконна затрыманыя асобы з'яўляюцца персонамі ЛГБТК+ ці рабілі дадзеныя здагадкі на падставе сваіх уяўленняў, заснаваных на стэрэатыпах, да іх часта прымянялася фізічны гвалт, часам паралельна з пагрозамі сексуалізаванага гвалту:

- *«Потом завели девушку. Как выяснилось, девушка – т- «Потым завялі дзяўчыну. Як высветлілася, дзяўчына – трансгендарная, не ведаю, як правільна. З яе пачалі здзекавацца, казаць, што "ён підар". Гэта былі супрацоўнікі ЦІПа ... ён не ведаў, што рабіць, як дзейнічаць... Ён спытаў у кагосьці – і той чалавек (нам нельга было круціць галавой, не ведаю, хто), сказаў: "таксама підар, стаў яго як мужыка". Яго ў жорсткай форме паставілі на расцяжку і далі дубінкай».*

- *«Але адзін з супрацоўнікаў у балаклаве паводзіў сябе як конченая мразь. Ён падумаў, што я мужчына... Ён падскочыў да мяне, схапіў за рукі і пачаў піхаць у супрацьлеглую сцяну. Даў мне паджопнік. Рукам было балюча, а паджопнік – было вельмі крыўдна і прынізліва. Пачаў крычаць, чаму я тут стаю, я павінен стаяць з мужчынамі. Я маўчу. А дзяўчаткі пачалі крычаць: "Гэта жанчына". Ён павярнуўся, сказаў мне зняць маску, я зняла, і ён сказаў, што ён у шоку».*

- *«У гэты час мяне ўсе білі, таму што нейкі дзядзька гадоў 40+ зайшоў у аўтазак і казаў: "О, забаўляйцеся, хлопцы, вы сёння можаце рабіць, што хочаце". Пасля гэтага мяне ха-*

*целі згвалтаваць: "О, давайце яго згвалтуем дубінкай!" У мяне былі пафарбаваныя пазногці ў чорны колер. Адзін з амапаўцаў спытаў у іншага: "Бляць, гэта ўвогуле нармальна, ён жа нейкі підар?"»*

- *«Другі раз у яго вельмі добра атрымалася, таму што я гэтага нават не чакаў. Ён проста галавой аб машыну біў. Пару разоў ударыў, у жывот біў, білі па нагах, але не дубінкай, а сваімі берцамі, таму што ўбачылі майку, сказалі, што калі на майцы крыжыкі-сперматазоіды ўверх – значыць, што гэта гей. І сказалі потым, што тут нікога няма, зробім цябе геем, дубінкі ў нас ёсць, нават можна і без дубінак зрабіць... І казалі, што "ў рот могуць даць"».*

## Паказанні сведкаў пра фізічны гвалт за прыналежнасць да ЛГБТК+, у тым ліку па здагадках і меркаваннях на падставе знешнасці:

- *«Вось адна дзяўчынка кажа, што яе прывезлі з дубінкай, яна там у нейкага АМАПаўца выхапіла, і яе прывезлі з дубінкай, і калі яе везлі ў аўтазаку, АМАПавец дастаў вазелін і сказаў: "Ведаеш, што гэта? Мы цябе зараз тут згвалцім, у лес завязем, усім натоўпам". Яна сказала: "А я лесбіянка", а ён такі: "Фуу, такіх не гвалтуем". Там шмат было тых, хто казаў пра згвалтаванне, што "па коле пусцім", неяк так. Білі яе па нагах, у яе нешта са звязкамі».*

- *«На аднаго хлопца выказалі здагадку, што ён гей, і яго моцна збівалі і абзывалі "підарасам". У нейкі момант ён заціх, яны сказалі, што гэта праблема і пачалі яго кудысьці зводзіць ці зносіць, а потым яго не было ўжо чуваць».*

- *«У наш аўтазак трапіў хлопец, у якога былі фотаздымкі, дзе ён цалуецца са сваім хлопцам, і яго назвалі вычварэнцам. Я не бачыў, што там адбывалася, таму што я стаяў тварам да сценкі. Але аўтазак хістаўся ад таго, што яго білі. То бок я не ведаю, што там было, але я бачыў яго збітым, і ён ехаў далей у шчэпцы ўвесь час. Яго нават не адпускалі».*

Многія пацярпелыя пацвярджалі сітуацыі, калі да людзей ЛГБТК+, людзей, якія выглядалі ненарматыўна, прымянялася больш гвалту.

## Сексуалізаваны гвалт

Сексуалізаваны гвалт у дачыненні да ЛГБТК+ часта спалучаецца з актамі вуснай і фізічнай гамафобіі, біфобіяй, трансфобіяй, іншымі фобіямі. Часам людзі з супольнасці ЛГБТК+ становяцца мішэнню менавіта з-за іх ідэнтычнасці[2]. Людзі, у дачыненні да якіх сілавікі выкарыстоўвалі пагрозы сексуалізаванага гвалту, асцерагаліся рэальных дзеянняў, паколькі яны былі. Па словах адной/аднаго пацярпелай/га, пасля таго, як сілавікі пераканаліся ў сексуальнай арыентацыі, пайшоў псіхалагічны гвалт, потым фізічны, і потым сексуалізаваны.

Пра гэта таксама сведчыць Вярхоўная камісарка ААН па правах чалавека Мішэль Бачэлет: «Нашыя дадзеныя пацвярджаюць факты згвалтавання затрыманых і прымянення іншых формаў сексуальнага і гендарнага гвалту ў дачыненні як мужчынаў, так і жанчынаў, – працягнула Бачэлет. – Медыцынскія запісы, вывучаныя УВКПЧ (Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека), паказваюць на наяўнасць траўмаў мужчынскіх геніталіяў. Да затрыманых таксама прымяняўся псіхалагічны ціск, у тым ліку пагрозы згвалтавання»[3].

У пацярпелых ад сексуалізаванага гвалту вялікая рызыка развіцця псіхалагічных і фізічных захворванняў, паколькі гэта адна з самых цяжкіх ступеняў гвалту.

2 https://pcar.org/about-sexual-violence/lgbtq (дата доступу: 01/05/2023).
3 https://news.un.org/ru/story/2022/03/1420122 (дата доступу: 01/05/2023).

# ВЫСНОВЫ

Людзі ЛГБТК+ часта адчуваюць страх і дыскрымінацыйнае стаўленне, якія адрозніваюцца ад агульных:

1) Небяспека быць «раскрытым» (страх аўтынгу), быць прымушаным раскрыць сябе, паведаміўшы пра сексуалізаваны гвалт (страх ісці ў паліцыю/міліцыю, казаць публічна пра сексуалізаваны гвалт).

2) Рызыка атрымання трансфобных, гамафобных і біфобных адказаў з боку сацыяльных службаў (псіхалагі_ні, псіхіят_аркі, гінекалагі_ні, уралагі_ні і інш.) і службаў дапамогі пацярпелым, праваахоўных органаў, юрыдычных і медычных супрацоўні_каў і іншых сістэмаў;

3) «Штодзённае чаканне» гвалту з-за сексуальнасці ці гендарнай ідэнтычнасці, які не будзе пакараны ці будзе названы «хуліганствам» (несувымерна пакараны).

Такім чынам, людзей ЛГБТК+, якія жывуць (ці жылі) у Беларусі, штодня дыскрымінуюць, у дачыненні да ЛГБТК+ часта выкарыстоўваецца мова нянавісці, злачынствы ў дачыненні да прадстаў_ніц ЛГБТК+ караюцца як «хуліганства», і гэта ўспрымаецца грамадствам як «слушнае» і (ці) «патрэбнае», а гвалт з боку сілавікоў заахвочваецца дзяржавай. Усё гэта

робіць немагчымым жыццё ў краіне. Узровень стрэсу павялічваецца, асабліва пасля падзеяў жніўня 2020 года. Да людзей прымянялі гвалт за колер і даўжыню валасоў, пазногцяў. Людзей прыніжалі, абражалі і прымянялі фізічную сілу за адзенне і асабістыя перапіскі, змесціва торбаў. Да людзей прымянялі розныя віды катаванняў з-за іх ідэнтычнасці, якая была раскрытая падчас незаконных затрыманняў, даглядаў, прымусу выдачы асабістай інфармацыі.

Падобнае стаўленне ўзмацняецца ЛГБТК+-фобнымі публікацыямі ў СМІ, публічнымі выказваннямі прадстаўнікоў рэжыму, якія фактычна ўтрымліваюць прыкметы правапарушэнняў, злачынстваў, аднак не караюцца – распальванне варожасці, пагрозы, абразы, прыніжэнні: Азаронак (вядучы праўладных шоу, прапагандыст)[1], Гладкая (праўладная прапагандыстка)[2], Шуневіч (былы міністр унутраных справаў)[3], Дзермант (праўладны філосаф, публіцыст, палітолаг)[4], Мукавозчык (публіцыст, прапагандыст)[5], Качанава (старшыня Рады Рэспублікі, супрацоўніца рэжыму)[6], ГУБАЗіК на чале з Ананенка (падраздзел МУС)[7] і інш.

Гэта ўзмацняе і падтрымлівае ЛГБТК+-фобію як у грамадстве, так і ў дзяржаве. Адсюль выцякае адсутнасць сувымернага і справядлівага пакарання за злачынствы на глебе нянавісці да ЛГБТК+ ва ўмовах прававога дэфолту, адсутнасць пакаранасці, адчуванне ўсёдазволенасці, прадстаў_ніцы ЛГБТК+ пакутуюць часцей. Сам факт затрымання становіцца вялізным стрэсам, які ўключае ў сябе штодзённыя страхі аўтынгу, гвалту ў вялікіх аб'ёмах і адсутнасці падтрымкі, паколькі невядома, якія погляды ў людзей, затрыманых разам з ЛГБТК+.

Такім чынам, у людзей ЛГБТК+ прысутнічаў страх трапіць пад катаванні з двух бакоў: дзяржавы і грамадства.

Пры гэтым нам варта рэагаваць на ЛГБТК+-фобію рэзка і прама, выступаючы супраць парушэнняў правоў людзей ЛГБТК+. Ужо зараз мы можам рэагаваць на мову нянавісці ў СМІ, даваць публічную і палітычную прастору прадстаў_ніцам ЛГБТК+, паколькі ў дэмакратычным грамадстве правы чалавека датычацца ўсіх людзей у грамадстве.

1 https://euroradio.fm/ru/raduzhnoe-znamya-sodoma-provlastnaya-propaganda-osedlala-temu-gomofobii (дата доступа: 01/05/2023).
2 https://by.tgstat.com/channel/@lgbelarussegodnya/19066 (дата доступа: 01/05/2023).
3 https://kyky.org/news/dyryavye-lgbt-i-nravstvennyy-mvd-chto-nagovoril-igor-shunevich-v-epichnom-intervyu-na-tv (дата доступа: 01/05/2023).
4 https://news.sb.by/video/lgbt-propaganda-navyazana-politikami-evropy-dlya-otvlecheniya-lyudey-ot-realnykh-problem-dzermant.html (дата доступа: 01/05/2023).
5 https://www.sb.by/articles/kak-solntse-otpravilos-vspyat.html (дата доступа: 01/05/2023).
6 https://www.belta.by/society/view/zakon-o-zaprete-propagandy-lgbt-mozhet-pojavitsja-v-belarusi-542513-2022/ (дата доступа: 01/05/2023).
7 https://www.dw.com/ru/gospropaganda-i-hejt-kak-rezhim-lukashenko-travit-lgbt/a-60587900 (дата доступа: 01/05/2023).



**Вы можаце падтрымаць нашу працу на Patreon**